***Тумашэўская В. А., Пяшко В. И.***

**ПЫТАННІ ЎРАЧЭБНАЙ ЭТЫКІ Ў АПОВЕСЦІ ВІКТАРА КАРАМАЗАВА “КРАЕМ БЕЛАГА ШЛЯХУ”**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н. В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

У беларускай літаратуры кожны чалавек можа знайсці адказы на ўсе жыццёвые пытанні. У ёй раскрываюцца тэмы чалавечых адносін, унутранай барацьбы чалавека паміж дабром і злом у цяжкіх жыццёвых сітуацыях, тэмы лёсу і чалавечага прызначэння. Важнае месца ў беларускай літаратуры прысвечана вобразу ўрача.

Віктар Карамазаў у сваёй аповесці “Краем белага шляху” апісвае жыццё доктара Валетава ў нялёгкі час пасля чарнобыльскай аварыі. Няўдалае сямейнае жыцце, прыхільнасць да алкаголю, страта надзей прыводзяць яго да няправільнага жыццевага шляху. Мы задаемся пытаннем: ці зможа ён знайсці ў сабе сілы, каб стаць прыкладам для людзей, бо хто, як не ён, можа вярнуць надзею і выратаваць жыццё. На працягу ўсяго твора чытач знаходзіцца ў напрузе, чакаючы адказу на гэта пытанне. І ён апраўдвае нашы надзеі. Доктар пачынае перайначваць сваё жыцце і, нарэшце, успамінае пра свой абавязак перад людзьмі.

Твор Віктара Карамазава “Краем белага шляху” вучыць нас, медыкаў, адказваць за жыцце кожнага чалавека, які мае патрэбу у дапамозе. Мы павінны помніць, што маем магчымасць і абавязак выратаваць жыцце, дапамагаць людзям не толькі справай, але і добрым словам.

Рэпазіторый БДМУ